# Вітаем вас дарагія дзеці і паважаныя бацькі!
# Запрашаем Вас у займальнае падарожжа выхаднога дня!

## ВАС ЧАКАЮЦЬ ЗАХВАТНЫЯ МАРШРУТЫ, ЗАЙМАЛЬНЫЯ ГУЛЬНІ І ДОБРЫ НАСТРОЙ!
## НЕ ЗАБУДЗЬЦЕ ЎЗЯЦЬ З САБОЙ: Даведнік па маршруту.

# Экскурсія
# "АБЕЛІСК ВОІНАМ-ЗЕМЛЯКАМ ЗАГІНУЎШЫМ У ГАДЫ ВЯЛІКАЙ АЙЧЫННАЙ ВАЙНЫ"

Від маршрута: пешы.
Рэкамендуемы ўзрост дзіцяці: старэйшы дашкольны ўзрост.
Працягласць: 1-2 гадзіны (у залежнасці ад цікавасці дзіцяці і ступені самаадчування).

***Аб'ект размешчаны ў цэнтральнай частцы аграгарадка Навасёлкі***

**Пацікаўцеся ў дзіцяці**: "Што і дзе ты чуў пра вайну? Што ты ведаеш пра Вялікую Айчынную вайну? Як ты думаеш, мы павінны памятаць пра тых, хто не прыйшоў з вайны? Як людзі захавалі памяць аб вайне? (пра герояў вайны напісана ў кнігах, вершах, песнях, знята многа кінафільмаў)".

**Раскажыце дзіцяці**: 22 чэрвеня 1941 года - адна з самых сумных дат у гісторыі Беларусі, дзень, які нельга забыцца. У гэты далёкі летні дзень людзі займаліся звыклымі справамі. Школьнікі рыхтаваліся да выпускнога вечара. Дзяўчынкі гулялі ў лялькі, няўрымслівыя хлапчукі скакалі конна на драўляных коніках, уяўляючы сябе салдатамі. Ніхто не падазраваў, што мірнае жыццё разбурыць вайна. На нашу Радзіму напалі ворагі, і людзі пайшлі ваяваць - абараняць сваю зямлю.

**Спытайце ў дзіцяці:** "Што такое помнікі? Для чаго яны?"

**Раскажыце дзіцяці**: “Слова "помнік" паходзіць ад слоў "памяць", "памятаць". Гэта скульптурныя збудаванні, абеліскі. Будуюць іх у гонар якога-небудзь героя вайны або важнай падзеі, каб людзі памяталі гэтых герояў на долю якіх выпаў цяжкі час вайны. Помнік — гэта напамін нам пра тых, хто загінуў у партызанскіх атрадах, на палях баёў, хто проста не дажыў да Дня Перамогі”.

"Мы знаходзімся на тэрыторыі абеліска воінам-землякам нашага аграгарадка. Сюды прыходзяць дарослыя і дзеці, прыносяць кветкі, ускладаюць вянкі, тут стаяць школьнікі ў ганаровай варце. Людзі розных узростаў і нацыянальнасцей захоўваюць у сваім сэрцы памяць аб тых, хто не вярнуўся з вайны. Абеліск у нашым аграгарадку быў устаноўлены ў 1967 г. Раскажыце дзіцяці аб ветэранах, героях Вялікай Айчыннай вайны... Іх засталося зусім мала...

Памятайце, ля помніка паводзяць сябе ціха, кладуць кветкі ля падножжа, мужчыны і хлопчыкі здымаюць галаўныя ўборы, стаяць некаторы час моўчкі, схіліўшы галаву і ціха адыходзяць.

Менавіта тут, вы і ваша дзіця дакранецца да гісторыі сваёй Радзімы.